# Сустрэча А. Барбашынскага з грамадскасцю г. Ашмян



17 ліпеня супрацоўнікі Дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага района» прынялі ўдзел ў сустрэчы з Андрэем Барбашынскім - даверанай асобай кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі, які акцэнтаваў увагу на пытаннях эканамічнага развіцця краіны, аховы здароўя і спорту, падтрымкі дзяцей і моладзі.

- У нашай краіне Прэзідэнт і ўся вертыкаль дзяржаўнай улады робяць вельмі шмат для таго, каб нашы дзеці маглі расці і развівацца, каб кожны чалавек адчуваў сябе ў бяспецы.

На Ашмяншчыне - радзіме алімпійскага чэмпіёна, дзе яго добра ведаюць, Андрэй Барбашынскі нярэдка бывае. Тут жыла яго цётка, тут ён дзіцем адпачываў у спартыўна-аздараўленчым лагеры, на мясцовых могілках спачываюць яго родныя.

Азіраючыся назад, Андрэй Барбашынскі нагадаў удзельнікам сустрэчы пра тое, з чаго пачынаўся шлях нашай незалежнай дзяржавы. За 26 гадоў зроблены вялізны крок наперад ва ўсіх сферах і галінах: будаўніцтве жылля і інфраструктуры, сацыяльнай падтрымцы, стварэнні ўмоў для самарэалізацыі асобы. Будуюцца бальніцы і спартыўныя комплексы, рэстаўруюцца помнікі архітэктуры, праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, якія дапамагаюць ствараць імідж Беларусі на міжнароднай арэне.

- Вядома, многія задачы яшчэ трэба ўвасобіць у жыццё, - падкрэсліў Андрэй Станіслававіч, - намечаны курс трымаць нам з вамі. А таму, робячы 9 жніўня выбар, мы павінны разумець, што вызначаем будучыню сваіх дзяцей.